Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_________ Н.У.Карчэўская
_________ 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/26-60 эвуч.

# НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МУЗЕЙНАЙ І ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма ўстановы адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-01-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*А.Я.Паўлава,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Д.К.Безнюк,* прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар сацыялагічных навук, прафесар;
*Ю.В.Кавалёва*, вучоны сакратар дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 30.01.2026);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 24.04.2026)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» займае важнае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Актуальнасць дадзенай вучэбнай дысцыпліны вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі супрацоўнікаў музейных і турыстычных устаноў. Вывучэнне нацыянальнага заканадаўства, нарматыўных актаў і міжнародных прававых актаў, уключаючы міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, садзейнічае фарміраванню ўсебакова развітага спецыяліста ў галіне музейнай справы, аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Вучэбная дысцыпліна накіравана на фарміраванне кампетэнцый выпускніка ва ўменні выкарыстоўваць нарматыўныя і прававыя дакументы ў музейнай працы і турыстычнай дзейнасці.

Змест вучэбнай дысцыпліны ахоплівае кола пытанняў, звязаных з веданнем і выкарыстаннем канстытуцыйных норм, палажэнняў Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь і закона Рэспублікі Беларусь «Аб турызме», норм грамадзянскага заканадаўства, заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў, нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць стандартызацыю ў Рэспубліцы Беларусь.

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» з'яўляюцца асноўныя крыніцы права, сістэма заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнае кіраванне музейнай дзейнасцю і турыстычнай галіной у Рэспубліцы Беларусь, віды і іерархія нарматыўных і прававых актаў, рэгулюючых дзейнасць музейных устаноў і сферы турызму, прававых актаў, пагадненні паміж галіновымі міністэрствамі Рэспублікі Беларусь, прававое рэгуляванне міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь у музейнай і турыстычнай сферы, прававое рэгуляванне аўтарскіх праў у музейнай дзейнасці, нарматыўна-прававая і метадычная база дзейнасці музеяў устаноў адукацыі, прававыя асновы дзейнасці турыстычных арганізацый і аказання турыстычных паслуг.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне ў студэнтаў цэласнага ўяўлення аб нарматыўна-прававым рэгуляванні музейнай галіны і турыстычнай дзейнасці на дзяржаўным узроўні, а таксама засваенне навыкаў аналізу і выкарыстання нарматыўных і прававых актаў, неабходных спецыялісту для работы ва ўмовах музея і турыстычнай дзейнасці.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– азнаямленне студэнтаў з прынцыпамі дзяржаўнага рэгулявання

музейнай і турыстычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь;

– фарміраванне комплексу ведаў па нарматыўна-прававым рэгуляванні музейнай сферы і турыстычнай дзейнасці, асноўных відах нарматыўна-прававых актаў і метадычных дакументаў;

– выпрацоўка ўмення прымаць рашэнні і здзяйсняць іншыя практычныя дзеянні ў дакладнай адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, аналізаваць прававыя акты ў сферы культуры, музейнай дзейнасці і турызму, арыентавацца ў крыніцах і спецыяльнай літаратуры.

У адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0322-03 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» прадугледжана фарміраванне ў студэнтаў наступнай кампетэнцыі: аналізаваць і ацэньваць сацыяльна-значымыя з'явы, падзеі, працэсы, праяўляць прадпрымальніцкую ініцыятыву і рэалізаваць сацыяльныя інавацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» студэнты павінны *ведаць*:

– асновы дзяржаўнага рэгулявання ў сферах музейнай і турыстычнай дзейнасці;

– змест нарматыўна-прававых актаў, якія рэгулююць адносіны ў музейнай дзейнасці і сферы турызму ў Рэспубліцы Беларусь;

– міжнароднае права ў сферы турызму і гасціннасці;

– прынцыпы дамоўных адносін у дзейнасці музейных устаноў, арганізацый і суб'ектаў у сферы турызму і гасціннасці;

– асновы стандартызацыі турыстычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь;

– спецыфіку выкарыстання аўтарскага права ў музейнай дзейнасці;

– парадак і спосабы вырашэння канфліктных сітуацый;

– пашпартна-візавыя і мытныя фармальнасці ў турызме.

Студэнты павінны *умець*:

– характарызаваць нарматыўна-прававыя акты, якія рэгулююць адносіны ў музейнай дзейнасці і сферы турызму і гасціннасці ў Рэспубліцы Беларусь;

– аналізаваць прававое рэгуляванне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне музейнай справы і турызму;

– складаць ліцэнзійныя дагаворы аб выкарыстанні малюнкаў музейных экспанатаў і будынкаў музеяў і дагаворы аб аказанні турыстычных паслуг;

– афармляць выплатнае (купля-продаж) і бязвыплатнае (дарэнне) набыцце і аднаўленне музейных прадметаў прыватнага фонду і фонду навукова-дапаможных матэрыялаў;

– афармляць уязныя і выязныя дакументы турыстаў;

– аналізаваць юрыдычныя факты, узнікаючыя ў сувязі з імі, адносіны ў сферы музейнай і турыстычнай дзейнасці.

Студэнты павінны *валодаць навыкамі*:

– выкарыстання тэарэтычных ведаў аб нарматыўна-прававых актах нацыянальнага заканадаўства і міжнароднага права;

– работы з нарматыўнымі прававымі актамі, якія рэгулююць адносіны ў сферы музейнай і турыстычнай дзейнасці;

– распрацоўкі дагавораў ў сферы дзейнасці музейных устаноў і турыстычнай індустрыі.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з вучэбнымі дысцыплінамі «Тэорыя і методыка музейнай справы», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Гісторыя і арганізацыя турызму», «Тэорыя турызму», «Менеджмент і маркетынг турызму», а таксама такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Турыстычны патэнцыял Беларусі», «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё самастойных даследчых навыкаў, пошук неабходнай інфармацыі ў навукова-метадычнай

літаратуры, інтэрнэт-крыніцах. Выкарыстоўваючы кантэнт-аналіз крыніц, прысвечаных актуальным праблемам турыстычнай дзейнасці, кожны студэнт падрыхтоўвае адпаведныя рэфераты і індывідуальныя даследчыя работы, прапаноўваюцца творчыя заданні, сумесная работа ў малых групах.

Актывізацыі самастойнай работы студэнтаў у накірунку пошуку і выкарыстання ведаў, атрымання самастойнага вопыта вырашэння задач садзейнічаюць такія дзейсныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі, як:

– гісторыка-тэматычны падыход;

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.)

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» усяго прадугледжана 90 гадзін, з іх 34 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 24, семінарскія заняткі – 10. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Змест і мэты вучэбнай дысцыпліны «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці». Музейная справа, ахова гісторыка-культурнай спадчыны і турыстычная індустрыя як напрамак культурнай дзейнасці, што ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння, актуалізацыі і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням. Асноўныя прафесійныя дэфініцыі і нарматыўныя паняцці і азначэнні ў сферы прававога рэгулявання музейнай дзейнасці і сферы турысцкіх паслуг. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі прафесійнага кірунку. Формы навучання і кантролю. Агляд літаратуры і крыніц па вучэбнай дысцыпліне.

## Раздзел I. Нарматыўна-прававое рэгуляванне дзейнасці музейных устаноў

### Тэма 1. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь

Права ў сістэме сацыяльнага рэгулявання. Норма права. Праваадносіны. Юрыдычны факт. Рэалізацыя і прымяненне права. Дзеянне нарматыўных прававых актаў у часе, у прасторы і па колу асоб. Сістэма права Рэспублікі Беларусь. Крыніцы права. Правατворчасць. Сістэма заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Віды і іерархія нарматыўных і прававых актаў. Юрыдычная сіла і парадак увядзення нарматыўнага і прававога акта ў дзеянне. Паняцце і віды юрыдычнай адказнасці. Заканадаўства ў сферы культуры.

### Тэма 2. Рэгуляванне працоўных адносін у дзейнасці музеяў і турыстычнай сферы

Прававое рэгуляванне працоўных адносін у музеях. Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Калектыўныя пагадненні. Паняцце, бакі, віды і змест працоўнага дагавора. Працоўны час і час адпачынку (паняцце і віды). Працоўныя і сацыяльныя адпачынкі. Працоўная дысцыпліна. Дысцыплінарная адказнасць работнікаў. Матэрыяльная адказнасць работніка за шкоду, прычыненую наймальніку. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове працы» (рэдакцыя 2023 г.). Правілы аховы працы. Найменні прафесій і пасад работнікаў. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб тыпавых штатах і нарматывах колькасці работнікаў музеяў» (2024). Пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні кваліфікацыйнага даведніка» пасад служачых, занятых у арганізацыях турызму» (у рэд. ад 30.08.2024 № 69). Патрабаванні да персанала.

ЕКСД. Выпуск 30. «Пасады служачых, занятых у культуры і мастацтве» (кваліфікацыйныя характарыстыкі пасад служачых культурна-асветных устаноў). Кодэкс этыкі музейных супрацоўнікаў. Правы супрацоўнікаў і прадпрымальнікаў турыстычнай індустрыі. Прававыя асновы развіцця, навучання і павышэння кваліфікацыі работнікаў арганізацый у музейнай і турыстычнай сферы.

### Тэма 3. Гісторыя развіцця нарматыўна-прававога рэгулявання ў сферы музейнай справы

Складанне асноў нарматыўнага забеспячэння музейнай дзейнасці ў XIX ст. Праватворчая дзейнасць Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры ў XIX – пачатку XX стст. Ахова археалагічных аб'ектаў. Указ 1848 г. «Аб назіранні за захаваннем помнікаў старажытнасці». Праекты закона «Аб ахове помнікаў» 1869 г. Заканадаўчыя і практычныя дзеянні па забеспячэнню аховы царкоўных помнікаў старажытнасці ў XIX – пачатку XX стст.

Савецкае заканадаўства аб культуры і Дэкрэты СНК 1918–1922 гг. аб забароне вываза і продажу за мяжу прадметаў мастацкага і гістарычнага значэння як прававая база аховы культурных каштоўнасцяў. Дэкрэты УЦВК, пастановы СНК аб рэгістрацыі збораў і асобных помнікаў мастацтва і даўніны з мэтай выдзялення прадметаў музейнага значэння і пастаноўкі іх на дзяржаўны ўлік. Пастанова СНК БССР «Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, мінулага, побыту і мясцовасцяў прыроды, якія з'яўляліся ўласнасцю навуковых устаноў і таварыстваў, а таксама прыватных асоб» (1923 г.) як прававая база фарміравання дзяржаўнага Музейнага фонду БССР.

Значэнне пастаноў ЦК КПСС і ЦК КПБ, пастаноў урадаў СССР і БССР, загадаў і распараджэнняў Міністэрстваў культуры СССР і БССР у вызначэнні і рэгламентаванні асноўных напрамкаў дзейнасці музейных устаноў у перыяд 1945–1991 гг. Тыпавое палажэнне аб музеях Беларускай ССР (1945 г.). Пастанова Савета Міністраў СССР «Аб мерах паляпшэння аховы помнікаў культуры» (1948 г.). Нарматыўныя дакументы, рэгулюючыя парадак камплектавання, уліку і захавання фондавых калекцый музеяў. Савецкая праватворчая дзейнасць у галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры ў другой палове XX стагоддзя. Палажэнне аб раённым краязнаўчым музеі ў БССР (1954 г.). Палажэнне аб Музейным фондзе БССР (1964 г.). Стварэнне фондавых камісіі пры найбуйнейшых музеях, абласныя і Рэспубліканская экспертныя камісіі. Закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры» (1969). Закон БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1978). Пастановы Савета Міністраў БССР аб стварэнні новых музеяў. Праграма

развіцця сеткі дзяржаўных музеяў і філіялаў у БССР да 2000 года (1989). Дзейнасць Праблемнага савета па пытаннях кансервацыі, рэстаўрацыі і экспанавання музейных калекцый пры Міністэрстве культуры БССР. Закон «Аб культуры ў Беларускай ССР» (1991).

## Тэма 4. Сістэма нарматыўнага-прававога рэгулявання музейнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Закон «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (рэдакцыі 1996, 2005, 2011 гг.). Закон «Аб культуры» (рэдакцыя 2005 г.). Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 435 «Аб некаторых пытаннях перамяшчэння музейных прадметаў і (або) музейных калекцый праз мяжу Рэспублікі Беларусь» (2006г.). Канцэпцыя развіцця музейнай справы (2004). Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь (рэдакцыі 2006, 2011 г.). Палажэнне аб парадку работы наведвальнікаў музеяў з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі (2006, 2011 гг.). Палажэнне аб асаблівасцях прававога статусу музея пад адкрытым небам, яго аховы і выкарыстання. Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэгулюючыя дзейнасць музейных установ.

Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь як аснова прававога рэгулявання музейнай дзейнасці. Паняцце музейнай дзейнасці. Сістэма дзяржаўных музеяў. Паўнамоцтвы і дзейнасць Рэспубліканскай рады дырэктараў музеяў і Рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па пытаннях музейнай справы. Права ўласнасці на музейныя прадметы, прадметы музейнага значэння. Асаблівасці стварэння і ліквідацыі музеяў. Правы і абавязкі музеяў. Асаблівасці матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і фінансавання музеяў. Стварэнне і дзейнасць музеяў-запаведнікаў і музеяў пад адкрытым небам.

Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. Прававыя асновы камплектавання музейнага фонду. Улік і захаванне прадметаў музейнага значэння, музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў. Правілы размяшчэння зброі пры ажыццяўленні дзейнасці, звязанай з калекцыянаваннем і экспанаваннем зброі і боепрыпасаў. Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду, якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству культуры арганізацыях, а таксама ў структурных падраздзяленнях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-уласныя паўнамоцтвы ў галіне культуры, і падначаленых ім арганізацыях.

Дзейнасць Рэспубліканскага рэстаўрацыйнага савета. Правы і абавязкі наведвальнікаў музеяў. Прававое рэгуляванне стварэння і адкрыцця пастаянных і часовых экспазіцый. Нарматыўнае рэгуляванне экскурсійнага

абслугоўвання наведвальнікаў музеяў. Правілы наведвання музейных устаноў Рэспублікі Беларусь. Прафесійныя і этычныя патрабаванні да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў.

### Тэма 5. Грамадзянска-прававое рэгуляванне дзейнасці музеяў

Музейныя каштоўнасці ў сістэме аб'ектаў грамадзянскіх правоў. Прававы рэжым музейных каштоўнасцяў як прадмет прававога рэгулявання. Сістэма і спецыфіка дагаворных адносін у музейнай сферы. Грамадзянска-прававыя дагаворы ў дзейнасці музейных устаноў. Афармленне выплатнага (купля-продаж) і бязвыплатнага (дарэнне) набыцця і карыстання музейных прадметаў асноўнага фонду і фонду навукова-дапаможных матэрыялаў. Палажэнне аб парадку рэалізацыі пераважнага права набыцця культурнай каштоўнасці, якая знаходзіцца ў прыватнай уласнасці (2023). Пагадненні паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь аб супрацоўніцтве ў пытаннях выкарыстання рэсурсаў музеяў краіны ў патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі. Пагадненні аб супрацоўніцтве паміж дзяржаўнымі музеямі г. Мінска і Галоўным упраўленнем па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Аўтарскае права ў музейнай дзейнасці. Правы на творы мастацтва, перададзеныя аўтарамі ў Музейны фонд. Выключныя правы аўтара музейнай экспазіцыі. Прававы рэжым выкарыстання музейных прадметаў, музейных калекцый і будынкаў музеяў і аб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі музеяў. Прававыя асновы дзейнасці віртуальных музеяў у Рэспубліцы Беларусь. Ліцэнзійны дагавор на выкарыстанне малюнкаў музейных экспанатаў і будынкаў музей. Прававыя асновы забеспячэння даступнасці музеяў для людзей з інваліднасцю.

### Тэма 6. Нарматыўна-прававая і метадычная база дзейнасці музеяў устаноў адукацыі

Нарматыўна-прававыя акты, рэгламентуючыя дзейнасць музеяў устаноў адукацыі. Кодэкс аб культуры Рэспублікі Беларусь. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 25 лістапада 2008 г. № 40 «Аб парадку ўліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду, якія знаходзяцца ў дзяржаўных музеях». Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 21 кастрычніка 2025 г. № 107 «Аб уліку прадметаў музейнага значэння, музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў». Тыпавая інструкцыя аб парадку ўліку, каталагізацыі, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў». Інструкцыя аб

парадку выкарыстання, уліку і захоўвання каштоўных металаў і каштоўных камянёў (2025). Метадычныя рэкамендацыі «Арганізацыя дзейнасці музеяў устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь» (2022). Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі дзейнасці музеяў устаноў адукацыі і выкарыстанні іх патэнцыялу ў арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў (2023). Загады па ўстанове адукацыі аб стварэнні музея, аб прызначэнні кіраўніка музея, акты перадачы музейнай калекцыі ад аднаго кіраўніка музея іншаму пры іх змене. Ахоўнае абавязацельства на сапраўдныя помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, аб'екты прыроды, прынятыя на дзяржаўны ўлік (з прыкладаемым спісам).

## Раздзел II. Прававое рэгуляванне турыстычнай дзейнасці

### Тэма 7. Сістэма дзяржаўнага кіравання ў сферы турызму ў Беларусі

Асноўныя прынцыпы і мэты дзяржаўнага рэгулявання ў сферы турызму. Прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнага рэгулявання ў сферы турызму. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сістэма і кампетэнцыя рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання турыстычнай дзейнасці. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальнае агенцтва па турызме» – галоўны рэгулятар у турыстычнай сферы. Міжведамасны экспертна-каардынацыйны савет па турызму пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Рэгіянальная вертыкаль кіравання сферай турызму. Сістэма і кампетэнцыя мясцовых органаў кіравання турыстычнай дзейнасцю. Абласныя і міжрэгіянальныя турыстычныя інфармацыйныя цэнтры і іх філіялы (ТІЦ). Дзяржаўныя праграмы ў сферы турызму «Беларусь гасцінная» (2016–2020, 2021–2025)», «Культурная прастора» (2026–2030), «Турызм» (2026–2030). Мэты і задачы, механізм рэалізацыі дзяржаўных праграм. Грамадскія аб'яднанні ў сферы турызму Рэспублікі Беларусь. Узаемадзеянне дзяржаўных органаў, турысцкіх прадпрыемстваў, грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый па правядзенні дзяржаўнай палітыкі ў сферы турызму.

### Тэма 8. Крыніцы прававога рэгулявання турысцкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Асноўныя акты прававога рэгулявання турысцкіх адносін у Рэспубліцы Беларусь: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь; Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь; Закон Рэспублікі Беларусь «Аб турызме», Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў». Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб развіцці аграэкатурызму. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 2025 г. № 329 «Аб удасканаленні дзяржаўнага

кіравання ў сферы турызму». Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2022 г. №523 «Аб аказанні турыстычных паслуг». Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 2 верасня 2022 г. № 584 «Аб адзінай класіфікацыі відаў турызму». Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 7 снежня 2022 г. № 839 «Аб мерах па падтрымцы турыстычнай індустрыі, развіццю ўнутранага турызму і міжнароднага ўязнога турызму». Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2026 г. № 5 «Аб рэгуляванні асобных грамадскіх адносін у сферы турызму». Інструкцыя аб парадку правядзення спецыяльных маніторынгаў міжнароднага ўязнога турызму і ўнутранага турызму. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь аб устанаўленні прафесійных і этычных патрабаванняў да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, аб парадку і ўмовах праходжання прафесійнай атэстацыі і падцвярджэння кваліфікацыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. Нацыянальная стратэгія развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь да 2035 года. Метадычныя рэкамендацыі дзяржаўнай установы «Нацыянальнае агенцтва па турызме» па распрацоўцы і правядзенні экскурсій.

## Тэма 9. Прававое рэгуляванне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне турызму і гасціннасці

Міжнароднае турысцкае права. Сістэма міжнародных нарматыўна-прававых актаў, якія рэгулююць адносіны ў сферы турызму. Міжнародныя акты, якія рэгулююць нормы паводзін дзяржаў, арганізацый, удзельнікаў і суб’ектаў турысцкай індустрыі ў сусветным маштабе. Прававое рэгуляванне міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы турызму. Міжнародны кодэкс абароны турыстаў. Міжнародныя арганізацыі па рэгуляванні ў турызме. Нарматворчасць Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (ААН) у сферы турызму. Міжурадавыя пагадненні і дагаворы. Міжнародныя канвенцыі (Міжнародная гасцінічная канвенцыя, Афінская канвенцыя па перавозцы морам пасажыраў і іх багажу і інш.). Дакументы і рэзалюцыі міжнародных арганізацый, якія датычацца сферы турызму (Агульная рэзалюцыя канферэнцыі ААН па міжнародным турызме і падарожжах), дакумент Акапулька сусветнай нарады па турызму, Манільская дэкларацыя па сусветнаму турызму, Гаагская дэкларацыя па турызме, Осакская дэкларацыя тысячагоддзя, Сеульская дэкларацыя і інш.). Хартыя турызму і Кодэкс турыста. Глабальны Этычны кодэкс турызму. Рэгуляванне ў турызме ў краінах СНД. Міждзяржаўны савет па турызме краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Стратэгія развіцця супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў у галіне турызму на 2021–2030 гады. Міжнародныя дагаворы

Рэспублікі Беларусь у сферы турызму. Пагадненні Рэспублікі Беларусь аб супрацоўніцтве ў сферы турызму з рэгіёнамі Расіі.

**Тэма 10. Арганізацыйна-прававыя формы турыстычных арганізацый**

Паняцце турыстычнай дзейнасці. Правы і абавязкі суб'ектаў турыстычнай дзейнасці. Паняцце арганізацыйна-прававой формы турыстычнай арганізацыі. Турыстычная дзейнасць як від прадпрымальніцкай дзейнасці, асноўныя арганізацыйна-прававыя формы прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы турызму. Нарматыўна-прававыя акты, рэгламентуючыя арганізацыйна-прававыя формы прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы турызму. Юрыдычныя прыкметы і асаблівасці гаспадарчых таварыстваў у сістэме турыстычных праваадносін. Індывідуальны прадпрымальнік як суб'ект прадпрымальніцкай дзейнасці ў сістэме турыстычных праваадносін. Фізічныя асобы як спецыяльныя суб'екты, якія аказваюць паслугі ў сферы аграэкатурызму. Дзяржаўная рэгістрацыя турыстычнай арганізацыі і індывідуальнага прадпрымальніка ў сферы турызму. Падрыхтоўка дакументаў для дзяржаўнай рэгістрацыі турыстычнай арганізацыі і індывідуальнага прадпрымальніка. Парадак рэгістрацыі ў якасці прадпрымальніка без утварэння юрыдычнай асобы і пастаноўка на ўлік у падатковым органе і пазабюджэтных фондах.

**Тэма 11. Прававое рэгуляванне аказання турыстычных паслуг**

Паняцце і віды турыстычных паслуг. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2022 г. № 523 «Аб аказанні турыстычных паслуг». Прававыя аспекты ўзаемадзеяння кліента і турпрадпрыемства. Гасцініцы і іншыя сродкі размяшчэння турыстаў як спецыяльны суб'ект турыстычных праваадносін. Віды дагавораў, якія рэгулююць праваадносіны паміж суб'ектамі і арганізатарамі турысцкай дзейнасці. Тыпавыя формы дагавораў у індустрыі турызму. Дагаворы, якія заключаюцца паміж тураператарам (турагентам) і турыстам. Дагаворы, якія заключаюцца паміж тураператарам і выканаўцамі асобных відаў паслуг. Тыпавая форма дагавора пры аказанні турыстычных паслуг. Нарматыўнае забеспячэнне арганізацыі экскурсійнага абслугоўвання. Дагавор аказання экскурсійных паслуг. Дагаворы з прадпрыемствамі размяшчэння і харчавання турыстаў. Прававое рэгуляванне транспартных паслуг у сферы турызму. Нацыянальныя і міжнародныя прававыя акты, рэгулюючыя аказанне транспартных паслуг у сферы турызму. Правілы перавозкі турыстаў паветраным, водным, чыгуначным і аўтамабільным транспартам. Грамадзянска-прававая адказнасць

за невыкананне або неналежнае выкананне абавязацельстваў па турыстычным абслугоўванні.

## Тэма 12. Прававыя асновы забеспячэння бяспекі ў турызме

Паняцце бяспекі ў турызме. Дзяржаўны стандарт 28681.3-95 «Патрабаванні па забеспячэнні бяспекі турыстаў і экскурсантаў». Прадастаўленне суб’ектамі турыстычнай дзейнасці інфармацыі аб правілах асабістай бяспекі турыста, экскурсанта. Адлюстраванне пытанняў бяспекі ў дамове з турыстам. Санітарна-эпідэміялагічныя правілы.

Страхаванне ў турызме. Віды страхавання ў турызме. Страхавы поліс. Страхавы выпадак. Дзеянні турыста і кіраўніка турысцкай групы пры наяўнасці страхавога выпадку. Страхаванне замежных грамадзян, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Страхаванне ад нявыезду. Страхаванне грамадзянскай адказнасці.

Прававая аснова абароны правоў спажыўцоў у Рэспубліцы Беларусь. Асаблівасці нарматыўна-прававога рэгулявання абароны правоў спажыўцоў у сферы турызму і гасціннасці. Палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў». Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў» у дачыненні да дагавора аб аказанні турыстычных паслуг. Грамадзянска-прававая адказнасць за парушэнне правоў спажыўцоў. Пакрыццё шкоды спажыўцу. Разгляд прэтэнзій кліентаў на якасць турыстычных паслуг.

## Тэма 13. Стандартызацыя і сертыфікацыя турысцкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Паняцце і ўзроўні стандартызацыі. Мэты і прававыя асновы стандартызацыі турысцкіх паслуг у Рэспубліцы Беларусь. Тэхнічныя нарматыўна-прававыя акты, якія вызначаюць стандарты для турысцкіх паслуг. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ацэнцы адпаведнасці патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі». Аб’екты стандартызацыі ў турысцка-экскурсійным абслугоўванні насельніцтва. Стандартызацыя гаспадарчай дзейнасці ў сферы турызму. Дзяржаўныя стандарты Рэспублікі Беларусь, якія дзейнічаюць у сферы турызму. Стандартызацыя сродкаў размяшчэння. Стандартызацыя сродкаў харчавання. Стандартызацыя транспартных сродкаў. Нарматыўна-прававыя акты, якія рэгламентуюць стандартызацыю ў сферы турыстычных паслуг у Рэспубліцы Беларусь. Пералік аказваемых турыстычных паслуг, класіфікаваных ў адпаведнасці з пунктам 4 СТБ 1352-2022 «Турыстычныя паслугі. Агульныя палажэнні». Праграма распрацоўкі дзяржаўных стандартаў Рэспублікі Беларусь у сферы турызму на 2025–2027 гады.

Прававыя асновы сертыфікацыі паслуг у Рэспубліцы Беларусь. Нарматыўна-прававое рэгуляванне дабраахвотнай сертыфікацыі турыстычных паслуг у Рэспубліцы Беларусь.

**Тэма 14. Турысцкія фармальнасці: прававое рэгуляванне ўезду/выезду з Рэспублікі Беларусь**

Прававое рэгуляванне выезду з Рэспублікі Беларусь грамадзян краіны. Прававое рэгуляванне ўезду, транзітнага праезду і знаходжання замежных грамадзян у Беларусі. Закон «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь» (рэд. 2025 г.). Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб устанаўленні бязвізавага ўезда і выезда замежных грамадзян (Указ №8 (2017), Указ №300 (2019) і Указ №251 (2021). Асаблівасці сучаснай пашпартна-візавай сістэмы. Дзеянні турыста ў выпадку страты дакумента, які сведчыць асобу. Спрошчаны візавы парадак ўезду ў асобныя краіны. Асаблівасці візавага і бязвізавага ўезду ў Рэспубліку Беларусь. Бязвізавы парадак уезду беларускіх турыстаў. Пагранічныя фармальнасці ў турызме. Парадак перасячэння Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь. Сістэма нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць парадак і ўмовы перасячэння граніцы Рэспублікі Беларусь. Мытныя фармальнасці. Парадак перамяшчэння замежнай валюты праз мытную граніцу. Парадак перамяшчэння і дэклаhравання турыстамі асобных груп тавараў. Працэдуры мытнага дэкларавання. Мытны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Санітарныя фармальнасці і патрабаванні ў дачыненні да эпідэміялагічнай бяспекі. Адказнасць турыстаў за парушэнне мытных правілаў.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № раздзела, тэмы | Назвы раздзелаў, тэмы | Колькасць аўдыторных адзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| | Уводзіны | 0,5 | | | |
| **I.** | **Раздзел I. Нарматыўна-прававое рэгуляванне дзейнасці музейных устаноў** | | | | |
| 1. | Тэма 1. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь | 1,5 | | 1 | Вуснае апытанне |
| 2. | Тэма 2. Рэгуляванне працоўных адносін у дзейнасці музеяў і турыстычнай сферы | 1 | 1 | | |
| 3. | Тэма 3. Гісторыя развіцця нарматыўна-прававога рэгулявання ў сферы музейнай справы | 2 | 1 | | |
| 4. | Тэма 4. Сістэма нарматыўнага-прававога рэгулявання музейнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | 1 | 1 | Падрыхтоўка рэфератаў, вуснае апытанне |
| 5. | Тэма 5. Грамадзянска-прававое рэгуляванне дзейнасці музеяў | 2 | 1 | | |
| 6. | Тэма 6. Нарматыўна-прававая і метадычная база дзейнасці музеяў устаноў адукацыі | 1 | | 1 | Падрыхтоўка рэфератаў |
| **II.** | **Раздзел II. Прававое рэгуляванне турыстычнай дзейнасці** | | | | |
| 7. | Тэма 7. Сістэма дзяржаўнага кіравання ў сферы турызму ў Беларусі | 1,5 | 1 | | |
| 8. | Тэма 8. Крыніцы прававога рэгулявання турысцкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь | 1 | 1 | 1 | Падрыхтоўка рэфератаў |
| 9. | Тэма 9. Прававое рэгуляванне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне турызму і гасціннасці | 1,5 | 1 | | |
| 10. | Тэма 10. Арганізацыйна-прававыя формы турыстычных арганізацый | 1 | 1 | | |
| 11. | Тэма 11. Прававое рэгуляванне аказання турыстычных паслуг | 1 | | 1 | Падрыхтоўка рэфератаў |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 12. | Тэма 12. Прававыя асновы забеспячэння бяспекі ў турызме | 2 | | 0,5 | Падрыхтоўка прэзентацый |
| 13. | Тэма 13. Стандартызацыя і сертыфікацыя турысцкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь | 1 | | 0,5 | Падрыхтоўка прэзентацый |
| 14. | Тэма 14. Турысцкія фармальнасці: прававое рэгуляванне ўезду/выезду з Рэспублікі Беларусь | 1 | | | |
| **Разам** | | **20** | **8** | **6** | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная літаратура*

1. Абрамова, П. В. Методика сохранения и актуализации объектов культурного наследия : учебное пособие для вузов / П. В. Абрамова. – 2-е изд. – Москва : Издательство Юрайт, 2023. – 85 с.

2. Гайдукевич, Л. М. Международное сотрудничество по обеспечению безопасности в туризме : учебно-методическое пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности «Международные отношения» / Л. М. Гайдукевич. – Минск : Четыре четверти, 2022. – С. 72–94.

3. Гужалоўскі, А. А. Гісторыя музейнай справы : вучэб.-метад. дапаможнік для спецыяльнасці перападрыхтоўкі 1-23 02 73 Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУКМ, 2022. – 228 с. – С. 140–178.

4. Кулемзин, А. М. Памятники истории культуры и их охрана : учебное пособие для вузов / А. М. Кулемзин. – 2-е изд. – Москва : Издательство Юрайт, 2020. – 103 с.

*Дадатковая літаратура*

1. Баринова, Е. Б. Организация работы по хранению музейных предметов и коллекций : учебник и практикум для вузов / Е. Б. Баринова. – Москва : Юрайт, 2022. – 88 с.

2. Богуславский, М. М. Культурные ценности в международном обороте: правовые аспекты / М. М. Богуславский. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : ИНФРА-М, 2018. – 416 с.

3. Кабушкин, Н. И. Менеджмент туристической индустрии : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования / Н. И. Кабушкин, О. В. Ежель. – Минск : РИВШ, 2022. – 418 с.

4. Кулемзин, А. М. Историко-культурное наследие и общество. Теория и методика охраны памятников : учебное пособие / А. М. Кулемзин. – URL: https://znanium.ru/catalog/document?id=344180.

5. Несцярчук, Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БелТА,2003. – 286 с.

6. Сафонов, А. А. Музейное дело и охрана памятников : учебник и практикум для вузов / А. А. Сафонов. – Москва : Юрайт, 2022. – 330 с.

## Метадычныя рэкамендацыі
## па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

У мэтах павышэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне «Нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай і турыстычнай дзейнасці» і фарміравання вучэбных кампетэнцый вучэбным планам спецыяльнасці прадугледжана самастойная работа студэнтаў, якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; фарміраванне ў іх уменняў і навыкаў самастойнага набыцця і абагульнення ведаў; уменняў і навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы; самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Самастойная работа дапамагае арганізаваць раўнамерную дзейнасць студэнтаў па вывучэнні прадмета, больш глыбока засвоіць яго; дасягнуць своечасовага выканання заданняў, сачыць за індывідуальным рэйтынгам.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі дакладаў, рэфератаў і прэзентацый па актуальных пытаннях прававога і нарматыўнага рэгулявання дзейнасці музейных устаноў і турыстычнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь.

## Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі вынікаў
## вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Бягучы кантроль ажыццяўляецца шляхам ацэнкі ведаў і актыўнасці студэнтаў на семінарскіх занятках у форме вусных адказаў, калоквіумаў, падрыхтоўкі рэфератаў, прэзентацый, індывідуальных і групавых праектаў.

Выкананне заданняў з'яўляецца абавязковым для ўсіх студэнтаў.

Асноўным сродкам засваення ведаў і авалодання неабходнымі кампетэнцыямі з'яўляецца праверка ведаў рознага тыпу (рэпрадуктыўных, рэканструктыўных, варыятыўных), у межах гадзін, якія прадугледжаны для семінарскіх заняткаў.

Для дыягностыкі могуць выкарыстоўвацца пісьмовая работа (рэферат, эсэ), творчае заданне, франтальнае апытанне, калоквіумы і іншыя формы кантроля.

## Дыягностыка сфарміраванасці кампетэнцый студэнта

Працэдура дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнта ўключае наступныя этапы:

– вызначэнне аб'екта дыягностыкі;

– выяўленне факту вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;

– вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта

патрабаванням адукацыйнага стандарта;

– ацэньванне вынікаў выяўлення і вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта (з дапамогай шкалы ацэнак).

**Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па актуальных пытаннях прававога і нарматыўнага рэгулявання дзейнасці музейных устаноў і турыстычнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь.

Для дыягностыкі кампетэнцыі студэнтаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў дыягностыкі:

– тэсты з выкарыстаннем заданняў адкрытай і закрытай формы па асобных раздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя заданні па асобных раздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– вуснае апытанне падчас заняткаў;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па распрацаваных імі тэмах;

– падрыхтоўка і абарона рэфератаў.